

ЗАГАРАЦЬ ЦІ НЕ? 5



ЯК ВАБІЛІ АЛЕНЯ 6

5 ЧЭРВЕНЯ 2019 г. СЕРАДА

№ 103 (28970)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

## КУРС — НА РАЗВІЦЦЁ СУПРАЦОЎНІЦТВА

### Беларусі ёсць чаму павучыцца ў Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт на сустрэчы з генеральным дырэктарам Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці Фрэнсісам Гары. Гэта арганізацыя ўзаемадзейнічае з нашай краінай па наступных кірунках: удасканаленне заканадаўства Беларусі ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі, развіццё нацыянальнай інфраструктуры, укараненне новых інфармацыйных тэхналогій і навучанне спецыялістаў.**

«Я магу называць вас старым сябрам, таму што з часу стварэння Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці мы стаялі каля яе вытокаў і адразу ж далучыліся да яе. У нас ужо вялікая гісторыя супрацоўніцтва», — адзначыў кіраўнік дзяржавы ў пачатку сустрэчы.

Прэзідэнт расказаў, што падчас візіту будзе падпісаны Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж беларускім урадам і гэтай арганізацыяй. У ім будуць вызначаны і замацаваны ўжо дасягнутыя асноўныя моманты сумеснай дзейнасці.

«Вы заўсёды можаце разлічваць на Беларусь, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Нягледзячы на тое, што мы даўно з'яўляемся членамі Сусветнай арганізацыі, супрацоўнічаем з ёй, тым не менш павінен прызнаць, што мы занадта маладая краіна, якая шчыльна пачала займацца абаронай правоў уласнасці, і нам шмат чаму трэба вучыцца. Вы нам у гэтым плане дапамагаеце».

На думку беларускага лідара, гэта сапраўды вялікая дапамога, асабліва ў плане адукацыйных праграм, падтрымкі беларускіх спецыялістаў. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў суразмоўніку за гэта.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу, што вывучыўшы інфармацыю пра Сусветную арганізацыю інтэлектуальнай уласнасці і пра самога Фрэнсіса Гары, ён са здзіўленнем зразумеў, што генеральны дырэктар — гэта адзін з нешматлікіх чыноўнікаў міжнароднага ўзроўню, які так шчыра і сумленна пагружаны ў эфектыўнасць работы арганізацыі.

СТАР. 2

## МОЖАМ БОЛЬШ

### Патэнцыял нашых адносін са Славакіяй значна вышэйшы за цяперашнія вынікі

**Такое меркаванне выказаў Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы са старшынёй Нацыянальнага савета Славацкай Рэспублікі Андрэем Данка.**

«Мне прыемна сустрэцца з вамі, прадстаўніком брацкага народа. Няма неабходнасці гаварыць пра тое, што мы з вамі маем адны карані, мы — славяне. Больш за тое, вы — член Еўрапейскага саюза, мы — член іншага эканамічнага саюза. Тым не менш гэта не перашкаджае выбудоўваць цёплыя, добрыя, сяброўскія адносіны. Я вельмі спадзяюся, што так будзе і надалей», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Ён падзякаваў суразмоўніку за тую ролю, якую Славакія сыграла ў нармалізацыі адносін Беларусі з Еўрапейскім саюзам. Таксама Прэзідэнт асабліва адзначыў ролю Славакіі ў гістарычным развіцці Еўропы. Гэта актуальна сёлета ў сувязі з такімі падзеямі, як 75 гадоў вызвалення Беларусі ад фашызму і 75 гадоў Славацкага нацыянальнага паўстання. «Славацкае паўстанне — гэта значная старонка антыфашысцкага руху ў Еўропе. Вельмі моцная старонка, якой можа ганарыцца славацкі народ», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Безумоўна, беларускі лідар закрануў палітычнае і эканамічнае ўзаемадзеянне паміж краінамі. Паводле слоў Прэзідэнта, дыпламатычныя адносіны паміж Беларуссю і Славакіяй знаходзяцца на вельмі высокім узроўні.

«Я часта канстатую факт высокіх палітычных адносін з той ці іншай дзяржавай і адставанне ў эканоміцы, гандлі. У адносінах са Славакіяй я гэтага сказаць не магу», — адзначыў ён і дадаў, што мы маем прыстойны тавараабарот — прыкладна 220 мільёнаў долараў па годзе.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што палітыка тут адыграла вельмі важную ролю ў плане падцягвання да гэтага ўзроўню і гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. «Гэта добра. Але патэнцыял у нас значна вышэйшы. Я думаю, калі б у нас сёння больш за мільярд быў тавараабарот, гэта было б заканамерна і нармальна», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. На яго думку, у гэтым плане яшчэ мае быць вялікая работа.

СТАР. 2

# «БЕЛАГРА-2019»: АД ПАРАСЯЦІ ДА ТРАКТАРА



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## Кантракты на суму каля ста мільёнаў долараў чакаюцца па выніках «БЕЛАГРА-2019»

Пра гэта паведаміў **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоль ХАЦЬКО** пасля ўрачыстай цырымоніі адкрыцця міжнароднага сельскагаспадарчага форуму. Прынамсі, у апошнія гады лічбы былі падобныя.

Як падкрэсліў міністр, аграпрамысловы комплекс Беларусі дэманструе станоўчую дынаміку развіцця. «Па вытворчасці абсалютнай большасці відаў сельгаспрадукцыі на душу насельніцтва Беларусь лідзіруе сярод краін СНД. Кожны работнік сельскагаспадарчай галіны корміць дваццаць чалавек у горадзе», — адзначыў Анатоль Хацько.

Сёння ў структуры беларускага экспарту сельская гаспадарка займае 16 %. Аграрны форум стаў традыцыйным і з году ў год збірае разам не толькі беларускіх аграрыяў, але і іх замежных калег і партнёраў. Сёлета ў выстаўцы ўдзельнічае каля 560 кампаній з 29 краін, у тым ліку Аўстрыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Ізраіля, Казахстана, Канады, Кітая, Польшчы, Расіі, ЗША, Украіны, Францыі.

«Апошнія пяць гадоў мы ўваходзім у пяцёрку лідараў краін-экспарцёраў малочнай прадукцыі ў свеце. Але неабходна рухацца наперад, шукаць перспектыўныя кірункі развіцця аграпрамысловага комплексу. Міжнародныя сельскагаспадарчыя выставачныя мерапрыемствы дазваляюць абагульніць сусветны вопыт», — падкрэсліў, вітаючы гасцей форуму, **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір ДВОРНІК.**

Развіццё аграпрамысловага комплексу — адзін з прыярытэтаў стратэгіі эканамічнага развіцця краіны. «Арганізацыі Мінпрама абіраюць пляцоўку «БелАгра» для дэманстрацыі сельгасмашын. Сёння на выстаўцы прадстаўлена больш за сто адзінак тэхнікі ад 14 арганізацый сістэмы», — паведаміў **міністр прамысловасці Павел УЦЮПІН.**

На плошчы каля 25 тысяч м$^2$ месцяцца не толькі камбайны, трактары, прэс-падборшчыкі, упакоўшчыкі і іншая тэхніка, але і буйная рагатая жывёла, коні, свінні. Ёсць і птушка, і рыба, і расліны — і, дарэчы, нават наша фіялетавая бульба. А на дэгустацыі можна пакаштаваць розных смачнасцяў ад сыру да гарбузовай ікры.

«Белагра-2019» у рамках Беларускага аграпрамысловага тыдня працягнецца да 9 чэрвеня. Сёння ў межах выстаўкі падпісваецца пагадненне аб стварэнні беларуска-кітайскай навукова-практычнай лабараторыі, а таксама абмяркоўваюцца праблемы і перспектывы малочнай жывёлагадоўлі Беларусі і Расіі.

**Варвара МАРОЗАВА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Наша незалежная дзяржава мае патрэбу ў таленавітай і адоранай моладзі. У Беларусі створана эфектыўная сістэма дзяржаўнай падтрымкі таленавітай моладзі, якая дазваляе кожнаму рэалізаваць свой патэнцыял і магчымасці, дабіцца высокіх дасягненняў і яркіх перамог. Ацэнка дзяржавай заслуг адоранай і таленавітай моладзі павінна стаць важным стымулам для далейшага ўдасканалення, а яе дасягненні і перамогі — дастойным унёскам у развіццё Беларусі».*

Сацыяльны клопат

## ІДЗІ НА ГУКІ



Адзін з журналістаў тэстуе сістэму на сабе.

### Для невідушчых людзей распрацавана спецыяльная сістэма навігацыі па горадзе

**Цяпер людзям са слабым зрокам і невідушчым стане прасцей перасоўвацца па Мінску — у сталіцы пачынаюць з'яўляцца маршруты, дзе ўвесь шлях абсталяваны адмысловымі гукавымі прыладамі, якія дапамагаюць арыентавацца ў прасторы. Канкрэтна для гэтай мэты распрацавана спецыяльная сістэма навігацыі «Крокі на гукі». Усё, што трэба будзе зрабіць невідушчаму чалавеку, — гэта спампаваць і ўстанавіць бясплатную мабільную праграму на тэлефон і ў далейшым — слухаць яе гукавыя падказкі. У распрацоўцы гэтай мабільнай праграмы, дарэчы, удзельнічалі самі людзі з інваліднасцю па зроку. А калі дакладней, сістэма навігацыі «Крокі на гукі» створана ўстановай рэабілітацыі інвалідаў па зроку «Цэнтр паспяховага чалавека», а ініцыятарам яе стварэння стала кампанія Volkswagen у Беларусі.**

СТАР. 5

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### МААС ПАПЯРЭДЗІЎ ПРА НАСТУПСТВЫ ГЛАБАЛЬНАГА ПАЦЯПЛЕННЯ ДЛЯ МІЖНАРОДНАЙ БЯСПЕКІ



**Кіраўнік МЗС ФРГ Хайка Маас расказаў, якія наступствы будзе мець глабальнае пацяпленне для міжнароднай бяспекі і міру на планеце.**

«Барацьба з наступствамі кліматычных змяненняў патрабуе, перш за ўсё, глабальных намаганняў», — заявіў ён у аўторак на міжнароднай канферэнцыі па пытаннях клімату і бяспекі ў Берліне. «Кліматычныя змены ў многіх рэгіёнах планеты з'яўляюцца пагрозай міру і стабільнасці», — лічыць Маас. Ён запэўніў, што Германія будзе весці больш актыўную работу ў справе пераадолення наступстваў глабальнага пацяплення і супрацоўнічаць з іншымі краінамі ў стварэнні сістэм прадухілення рызык.

Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства ФРГ заклікаў разглядаць сітуацыю з бяспекай комплексна, улічваючы пагрозы, якія ўзнікаюць у сувязі з кліматычнымі зменамі. «Вынікам з'яўляюцца ўцёкі людзей і міграцыя, яны дадаткова абвастраюць крызісы», — папярэдзіў Маас.

### РАСІЙСКАЯ ПАЛІЦЫЯ ЎЗБУДЗІЛА СПРАВУ З-ЗА КРАДЗЯЖУ МОСТА Ў МУРМАНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**Паліцыя ў Мурманскай вобласці распачала крымінальную справу пасля крадзяжу 56-тоннага моста праз раку Умба ў Мурманскай вобласці. Пра гэта паведамляецца на сайце пракуратуры вобласці.**

У паліцыі паведамілі аб крадзяжы апоры моста 29 мая. Па асноўнай версіі, апору выкралі і разрэзалі для здачы на металалом.

«Па версіі следства, у маі 2019 года нявызначаныя асобы тайна, з карыслівых меркаванняў выкралі металічныя канструкцыі даўжынёй 23 метры і вагой 56 тон, якія належаць адной з арганізацый, што ажыццяўляюць гаспадарчую дзейнасць у Кіраўскім раёне, чым прычынілі матэрыяльны ўрон уласніку на суму звыш 600 тысяч рублёў», — гаворыцца ў паведамленні пракуратуры.

### НА ЯКІМ ПАВЕРСЕ ЛЕПШ ЖЫЦЬ?

**Чалавек не проста інстынктыўна баіцца вышыні. Акрамя новых адчуванняў вышыня прыносіць чалавеку і праблемы са здароўем. У групу рызыкі трапляюць не толькі альпіністы, але і авіяпасажыры, і нават жыхары шматпавярховікаў.**

Аказваецца, жыццё на верхніх паверхах высотак можа быць небяспечным. Паводле апошніх даследаванняў амерыканскіх вучоных, лепш за ўсё сяліцца не вышэй за сёмы паверх. Прычына, на іх думку, заключаецца ў магнітным полі Зямлі, якое з вышынёй слабее, тым самым ствараючы рызыку нагрузкі на імунную, нервовую і сардэчна-сасудзістую сістэмы чалавека.

Ёсць і іншыя прычыны не забірацца занадта высока. Эколагі лічаць, што паветра на вышыні, насычанае выкідамі прадпрыемстваў буйных гарадоў, не такое чыстае і ўтрыманне шкодных рэчываў на вышыні ад 30 метраў (а гэта дзясяты паверх) можа перавышаць дапушчальны ўзровень. Іншая праблема, здольная даставіць непрыемнасці жыхарам гмахаў, — электрамагнітнае выпраменьванне. Вядома, бытавая тэхніка і праводка «фаняць» аднолькава што на першым, што на 15-м паверсе, аднак жалезабетонная канструкцыя, перашкаджаючы праходжанню электрамагнітных хваляў, прымушае іх цыркуляваць па кватэры, аддаючы частку фону на больш высокія паверхі.

Медыкі адзначаюць, што жыхары верхніх паверхаў панэлек часцей за іншых пакутуюць на галаўны боль і дэпрэсіі.

ISSN 1990 - 763X

## КОРАТКА

- Санітарныя службы Беларусі з пачатку сезона яшчэ не выносілі абмежаванняў па купанні.
- **Дванаццацігадзінны фартэпіянны марафон пройдзе 22 чэрвеня ў Белдзяржфілармоніі.**
- Даследаванне паказала, што 24 % насельніцтва Беларусі бярэ ўдзел у абароне навакольнага асяроддзя, здзяйсняючы нейкія канкрэтныя дзеянні, напрыклад, эканомячы ваду і энергію, сартуючы смецце і да т. п.
- **У нашай краіне з пачатку года зарэгістравана 128 выпадкаў адру.**
- У Беларусі назіраецца зніжэнне колькасці арганізацый з заработнай платай да 400 рублёў.

Цікавыя канікулы

## ЛЕТА ПАТРЫЁТАЎ

### Чым здзівяць дзятву віцебскія гвардзейцы?



**У 103-й асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгадзе, якая дыслакуецца ў Віцебску, школьнікі цікава праводзяць лета. Тут у панядзелак запрацаваў ваенна-патрыятычны летнік «Патрыёт». Штодня хлопчыкаў і дзяўчынак, самым маленькім з якіх па 12 гадоў, чакаюць афіцэры і салдаты, каб з карысцю правесці час разам. Маленькіх гасцей вучаць таму ж, чаму і дэсантнікаў, якія праходзяць тэрміновую службу. Напрыклад, школьнікі могуць паспрабаваць сабраць парашут. Іх навучаць адпрацоўваць на зямлі дзеянні парашутыста ў небе, у тым ліку падчас няштатных сітуацый, маскіраваць тэхніку і рабіць шмат чаго іншага. Карэспандэнт «Звязды» прыйшоў на адкрыццё першай лагернай змены.**

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем цікавае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# КУРС — НА РАЗВІЦЦЁ СУПРАЦОЎНІЦТВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Вось у гэтым плане ваша дзейнасць заслугоўвае ўсялякага адабрэння, заахвочвання і павагі. І ў сувязі з гэтым мы яшчэ больш намаганняў прыкладзём для таго, каб у нас была ў парадку нарматыўна-прававая база абароны правоў уласнасці, а таксама — калі гэта трэба — мы пастараемся ўнесці дастойны ўклад і ў распрацоўку міжнародных праектаў, пагадненняў, дагавораў па развіцці ў гэтай частцы па ўсёй планеце», — дадаў ён.

У адказ Фрэнсіс Гары адзначыў, што для яго гэтая сустрэча — вялікі гонар і радасць. Ён звярнуў увагу, што Мінск — чыстая сталіца і вельмі прыгожы горад. Генеральны дырэктар падзякаваў за ўсю падтрымку яго арганізацыі з боку Беларусі.

Размаўляючы з журналістамі па выніках сустрэчы ён падкрэсліў, што наша краіна з'яўляецца вельмі важным і актыўным членам гэтай арганізацыі. «Мы цэнім ўсю інфармацыю, якой дзеліцца Рэспубліка Беларусь, увесь вопыт, які назапашаны ў вашай краіне, асабліва ў галіне навукі і тэхналогій», — адзначыў генеральны дырэктар.

Фрэнсіс Гары таксама дадаў, што ўсе мы жывём у даволі неспакойным свеце, таму яго арганізацыі асабліва важна мець такіх надзейных паплечнікаў, як Беларусь, якія заўсёды гатовы да канструктыўнага супрацоўніцтва.

Ён адзначыў, што ў Беларусі ёсць чаму павучыцца ў галіне навукі і тэхналогій, ІТ. Акрамя таго, арганізацыя разглядае Мінск у якасці пляцоўкі для правядзення сваіх мерапрыемстваў, у тым ліку канферэнцый у гэтай сферы.

«Справа ў тым, што сёння ў свеце можна назіраць канкурэнцыю, якая расце, асабліва ў галіне навукі і тэхналогій. Гэтая сфера — краевугольны камень прагрэсу для чалавецтва. І ва ўмовах гэтага росту канкурэнцыі вельмі важна развіваць палітыку шматпалярнасці. Беларусь валодае ў першую чаргу выдатнымі кадравымі рэсурсамі, якія дазваляюць развіваць навуку і тэхналогіі. Акрамя таго, Беларусь прасоўвае падыход шматпалярнасці, асабліва калі гаворка заходзіць пра такія складаныя пытанні, як штучны інтэлект, робататэхніка, буйныя масівы даных. Тут патрабуецца міжнароднае абмеркаванне, дыскусіі на раўнапраўнай аснове», — сказаў журналістам генеральны дырэктар арганізацыі.

У рамках візіту ў Фрэнсіса Гары запланаваны сустрэчы з кіраўніцтвам Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі і адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій, а таксама з прэм'ер-міністрам Сяргеем Румасам і міністрам замежных спраў Уладзімірам Макеем.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# МОЖАМ БОЛЬШ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пры гэтым беларускі лідар падкрэсліў: без актыўнай ролі парламентарыяў цяжка было б дасягнуць такіх вынікаў у супрацоўніцтве. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка падзякаваў славацкаму парламенту за тую вялікую ролю, якую ён іграе ва ўзмацненні супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў.

Старшыня Нацыянальнага савета Славацкай Рэспублікі Андрэй Данка па выніках сустрэчы з Прэзідэнтам расказаў журналістам, што адна з тэм, якую ён абмеркаваў з кіраўніком дзяржавы, — гэта ўзаемнае прызнанне дыпломаў аб адукацыі. Таксама казалі пра магчымасці эканамічнага супрацоўніцтва, пра перспектывы ўзаемнай работы ў сельскай гаспадарцы.

«Але больш за ўсё ўвагі мы прысвяцілі рызыкам, звязаным з сучаснай лічбавай эпохай. Перш за ўсё, абароне нашых дзяцей у лічбавай прасторы. Так, каб мы захавалі нашу славянскую дабрыню і нашы славянскія карані. Як еўрапейская дзяржава, мы вельмі добра разумеем, якія рызыкі звязаны з медыяпрасторай інтэрнэту — і як небяспечна, калі яе сродкі пачынаюць уплываць на палітыку»,— расказаў ён.

Яшчэ на сустрэчы абмяркоўвалі тое, як важна шанаваць і паважаць сваю гісторыю. Андрэй Данка выказаў захапленне тым, як гэта арганізавана ў Беларусі. Дарэчы, падчас свайго візіту ён наведаў Музей Вялікай Айчыннай вайны — і ў сувязі з гэтым старшыня Нацыянальнага савета Славакіі звярнуў увагу, што ў нашай краіне памятаюць не толькі сваіх, але і славацкіх воінаў. «У сувязі з гэтым я запрасіў вядучых асоб дзяржавы на ўрачыстае святкаванне 75-годдзя Славацкага нацыянальнага паўстання», — дадаў ён.

Андрэй Данка асабліва адзначыў, што народы Беларусі і Славакіі — сапраўды вельмі блізкія народы, якія маюць велізарны патэнцыял супрацоўніцтва і могуць шмат чаму адзін у аднаго навучыцца.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

Узаемадзеянне

# Захад ці Усход — не дылема

## Развіццё «Усходняга партнёрства» павінна ўключаць дыялог паміж ЕС і ЕАЭС

**Такое меркаванне міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ выказаў на адкрыцці экспертнага семінара «10 гадоў Усходняму партнёрству: вынікі і перспектывы», які адбыўся на пляцоўцы Савета па міжнародных адносінах «Мінскі дыялог». У сваім выступленні кіраўнік знешнепалітычнага ведамства прадставіў бачанне ролі ініцыятывы ў адносінах Беларусі з Захадам і Усходам.**

Беларусь выступае за развіццё «Усходняга партнёрства» як прагматычнага, раўнапраўнага і гібкага інструмента супрацоўніцтва і зніжэння канфрантацыі. Пашырэнне гэтай ініцыятывы, на думку Уладзіміра Макея, павінна суправаджацца мерамі даверу, якія ўключаюць дыялог Еўрапейскага і Еўразійскага эканамічнага саюзаў.

«Абмен інфармацыяй, гарманізацыя стандартаў і тэхнічных рэгламентаў, ліквідацыя залішніх перашкод у гандлі, заахвочванне кааперацыі на ўзроўні краін — членаў абодвух саюзаў — усе гэтыя перспектыўныя і запатрабаваныя тэмы супрацоўніцтва палітычна нейтральныя і працуюць на доўгатэрміновую стабільнасць і росквіт у маштабах усёй Еўропы, — лічыць міністр. — Не бачу, чаму выгаднае абодвум бакам узаемадзеянне павінна ўпірацца ў палітычныя перашкоды».

Існаванне канкурыруючых гандлёвых рэжымаў падштурхоўвае краін да выбару паміж імі і не толькі ў эканамічным плане. «Блокавасць у эканоміцы спараджае блокавасць у палітыцы, — падкрэсліў Уладзімір Макей. — Дыялог ЕАЭС — ЕС дазволіў бы ліквідаваць гэтую блокавасць, развеяць міф аб несумяшчальнасці ўсходняй і заходняй эканамічных і каштоўнасных сістэм. Бо менавіта гэты міф як аснова памылковага выбару, да якога спрабуюць падштурхнуць постсавецкія краіны, з'яўляецца першапрычынай многіх канфліктаў».

Тэму ўдзелу Беларусі ва «Усходнім партнёрстве» кіраўнік беларускага МЗС абмяркоўваў на нядаўняй сустрэчы са сваім расійскім калегам Сяргеем Лаўровым. Расія разумее імкненне Беларусі да ўзаемадзеяння з ЕС, які з'яўляецца другім па значнасці гандлёвым партнёрам.

«Апошнім часам, на наш погляд, Расія стала больш разумець, што ўдзел Беларусі ў ініцыятыве «Усходняе партнёрства» не накіраваны супраць Расіі», — адзначыў Уладзімір Макей.

Перагаворы па паглыбленні інтэграцыйнага супрацоўніцтва з усходняй суседкай, па яго словах, ідуць у рэжыме «руціннай работы», таму падрабязнасці не вартыя ўвагі.

У сваім выступленні міністр спыніўся на планах узмацнення ваеннай прысутнасці ЗША ў Польшчы, назваўшы гэты крок «глыбока памылковым» і «правакуючым далейшую напружанасць».

Асабліва перспектыўным з'яўляецца трохбаковы фармат праектаў «КНР — краіны «Усходняга партнёрства» — ЕС»: праз некалькі гадоў «Вялікі Шаўковы шлях» састыкуецца з еўрапейскай транспартнай сеткай TEN-T.

Пашырэнне такіх сувязяў патрабуе спрашчэння сістэмы перасячэння граніцы з Еўрапейскім саюзам. Для вырашэння пытання патрэбна гатоўнасць абодвух бакоў.

«Трэба проста сесці за стол перагавораў і вызначыцца, што нам трэба для таго, каб і перавозчыкі, і звычайныя грамадзяне праходзілі гэтую мяжу ў нармальным рэжыме, каб не было такога, што людзі чакаюць па 10—15 гадзін, а то і суткі, асабліва калі гэта прыходзіцца на святы», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

Бягучы год — юбілейны для ініцыятывы «Усходняе партнёрства». Наша краіна неаднойчы заяўляла пра гатоўнасць правесці святочныя сустрэчы ў Мінску.

«Восенню гэтага года мы з калегамі з Еўрапейскай службы знешніх дзеянняў плануем правесці ў Мінску афіцыйныя мерапрыемствы высокага ўзроўню з нагоды 10-годдзя «Усходняга партнёрства». А ў перспектыве спадзяёмся прыняць у сябе і чарговы саміт «Усходняга партнёрства», — сказаў кіраўнік МЗС.

У семінары, арганізаваным румынскім старшынствам у Савеце ЕС, прынялі ўдзел Генеральны дырэктар па справах Усходняга суседства МЗС Румыніі А. Станеску, паслы па асобых даручэннях МЗС Польшчы Я. Мултаноўскі і МЗС Швецыі С. Бургсталер, палітычны каардынатар Генеральнага дырэктарату Еўракамісіі па Еўрапейскай палітыцы суседства і перагавораў аб пашырэнні ЕС В. Байкоў, намеснік начальніка аддзела «Усходняга партнёрства», рэгіянальнага супрацоўніцтва і АБСЕ Еўрапейскай службы знешніх дзеянняў Р. Дарскі, прадстаўнікі аналітычнай супольнасці краін ЕС і «Усходняга партнёрства».

**Паводле БелТА.**

# Узгадняючы пазіцыі

**Сяргей Румас абмеркаваў пытанні інтэграцыі з дзяржсакратаром Саюзнай дзяржавы Рыгорам Рапотам.**

Падрыхтоўка праграмы дзеянняў па інтэграцыі ў Саюзнай дзяржаве Беларусі і Расіі стала нагодай для сустрэчы. Пра тое, што гэты дакумент павінен быць гатовы да 21 чэрвеня, дамовіліся прэм'ер-міністры дзвюх краін падчас перагавораў у маі. Такую ж задачу для кіраўнікоў урадаў паставілі і прэзідэнты Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін на палях саміту ЕАЭС у Нур-Султане.

«Да 21 чэрвеня мы павінны мець узгодненую абноўленую праграму дзеянняў, — сказаў Сяргей Румас. — На 70 % мы сыходзімся. Групы працуюць, я практычна штодня заслухоўваю справаздачы, як усё рухаецца. І для сябе паставіў такую задачу, каб ужо да размовы з Дзмітрыем Анатолевічам [Мядзведзевым. — **Зв.**] мы на 90 % узгаднілі пазіцыі».

Калі бакі поўнасцю вырашаць усе супярэчлівыя пытанні, кіраўнікі краін правядуць сустрэчу на вышэйшым узроўні і абмяркуюць далейшыя крокі па ўзаемадзеянні.

**Паводле БелТА.**

Экатэхналогіі

# ЦАГЛІНКІ ДЛЯ «ЗЯЛЁНЫХ» ГАРАДОЎ

## Грамадская ініцыятыва, падтрымка дзяржавы і экалагічна чыстыя тэхналогіі — аб'яднаўшы гэтыя складнікі, магчыма палепшыць якасць жыцця ў гарадах і рэгіёнах краіны, упэўненыя эксперты

**У апошнія 25 гадоў экалагічная палітыка Беларусі накіравана на комплекснае рашэнне задач, што датычацца зніжэння антрапагеннай нагрузкі на экасістэмы, павышэння выкарыстання аднаўляльных рэсурсаў. З 2016 да 2020 года ў краіне рэалізуецца Нацыянальны план дзеянняў па развіцці «зялёнай» эканомікі.**



**5 чэрвеня ў нашай краіне адзначаецца Дзень аховы навакольнага асяроддзя. Сваё віншаванне з нагоды свята адрасаваў і міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК:**

— Сёння праблемы экалогіі стаяць у шэрагу самых важных, вызначаючы ўзровень дабрабыту ўсёй сусветнай цывілізацыі. Захаваць навакольнае асяроддзе і прыродныя рэсурсы для наступных пакаленняў — наша агульная і прыярытэтная задача.

З кожным годам да аховы навакольнага асяроддзя далучаецца ўсё больш жыхароў Беларусі. Асаблівай павагі заслугоўвае маладзёжны экалагічны рух, удзельнікамі якога стала ўжо больш за пяць тысяч студэнтаў і неабыякавых да экалагічных праблем маладых людзей.

Дазвольце павіншаваць усіх, хто стаіць на варце прыроды, за стваральную працу і прафесіяналізм, за адданасць і вернасць справе. Упэўнены, што сумеснымі намаганнямі мы зможам зберагчы і прымножыць багацце і прыгажосць беларускай зямлі.

Як расказала **начальнік галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Кацярына КУЗНЯЦОВА,** адно з такіх мерапрыемстваў — рэалізацыя інстытута «зялёных» закупак з мэтай прасоўвання ідэі спажывання і вытворчасці экалагічна чыстых прадуктаў.

У апошнія гады Беларусь разам з сусветнай супольнасцю прытрымліваецца вектара ўстойлівага развіцця, закліканага ўзгадніць намаганні па эканамічным росце, які павінен не шкодзіць якасці навакольнага асяроддзя і забяспечваць пры гэтым сацыяльную справядлівасць. Сёлета тэма ўстойлівага развіцця гарадоў стане цэнтральнай падчас юбілейнага XV Рэспубліканскага экалагічнага форуму, які пройдзе 7 і 8 чэрвеня ў Навагрудку.

Па словах Кацярыны Кузняцовай, вялікая работа ў краіне вядзецца для развіцця аднаўляльных крыніц энергіі. На 1 студзеня 2019 года сумарная электрычная магутнасць установак АКЭ склала 402,8 МВт — гэта 55 фотаэлектрычных, ці сонечных, станцый, 51 гідраэлектрастанцыя, 98 ветраўстановак. Дарэчы, найбуйнейшы ветрапарк у краіне пабудаваны менавіта ў Навагрудку. Там дзейнічае шэсць аб'яднаных ветраэнергетычных установак магутнасцю 9 МВт.

Электраэнергія паціху «захоплівае» і пасажырскі транспарт. Так, у пачатку 2019 года доля электрыфікаванага грамадскага транспарту ў Мінску склала 39,2 % ад агульнай колькасці пасажырскага наземнага транспарту, які эксплуатуе КУП «Мінсктранс». Развіваецца і сістэма зарадных станцый — яны будуюцца ў месцах стаянкі аўтамабіляў, на буйных аўтамагістралях і аб'ектах прыдарожнага сэрвісу. У мінулым годзе ПА «Беларуснафта» ўвяла ў эксплуатацыю 65 такіх станцый.

Каб вывучыць перспектывы развіцця электратранспарту ў Беларусі, Мінпрыроды і ПРААН плануюць рэалізаваць адпаведны праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Першыя вынікі гэтай работы яны разлічваюць атрымаць праз год-паўтара.

У апошнія гады ў Беларусі ўсё больш гарадоў далучаецца да такой міжнароднай ініцыятывы, як «Пагадненне мэраў па клімаце і энергіі». Галоўная яго мэта — устойлівае энергетычнае развіццё на мясцовым узроўні, прыняцце мер па змякчэнні наступстваў змены клімату. Сёння падпісантамі ініцыятывы з'яўляецца больш за 40 беларускіх гарадоў.

Як расказала **начальнік упраўлення рэгулявання ўздзеянняў на атмасфернае паветра, змену клімату і экспертызы Мінпрыроды Наталля АЛЕЙНІКАВА,** далучаючыся да гэтай ініцыятывы, гарады і раёны бяруць на сябе абавязацельствы скараціць да 2030 года выкіды парніковых газаў на 30 %. Мясцовыя ўлады імкнуцца рабіць усё магчымае, каб стварыць зручнае асяроддзе пражывання для насельніцтва:

— Іншыя гарады, што пакуль не далучыліся да «Пагаднення мэраў», павінны ведаць: неабходна выкарыстоўваць усе крыніцы для ўкаранення такіх інавацый, каб рухацца да разумнага «зялёнага» горада і ствараць для сваіх людзей камфортныя ўмовы пражывання.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

Падзея

# МІЛІЦЫЯНЕРЫ АДЗНАЧЫЛІ НАВАСЕЛЛЕ

**У Мінску быў урачыста адкрыты новы будынак Партызанскага РУУС. Чатырохпавярховы дом месціцца на вуліцы Ваўпшасава. Павіншаваць супрацоўнікаў прыехалі міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларусь Ігар Шуневіч, яго намеснік Аляксандр Барсукоў, начальнік ГУУС Мінгарвыканкама Іван Кубракоў, намеснік старшыні Мінгарвыканкама Арцём Цуран.**



Міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ і намеснік старшыні Мінгарвыканкама Арцём ЦУРАН падчас урачыстай цырымоніі.

Гісторыя міліцыі Партызанскага раёна вядзе адлік з 1977 года. Увесь гэты час РУУС знаходзілася ў старым будынку ў пасёлку МТЗ. На будаўніцтва новага аб'екта было затрачана шмат часу — каля васьмі гадоў. І вось нарэшце пераезд адбыўся.

— Гэта знакавы дзень, — заўважыў **начальнік Партызанскага РУУС Мінска падпалкоўнік Дзмітрый БУРДЗЮК.** — Тут будуць размешчаны ўсе службы і падраздзяленні, якія адносяцца да Упраўлення ўнутраных спраў раёна. Раней мы размяшчаліся ў некалькіх будынках, цяпер аддзел па грамадзянстве і міграцыі, дзяжурная служба, крымінальная міліцыя, міліцыя грамадскай бяспекі, ДАІ сабраны ў адно цэлае. І больш за тое — у новым будынку ёсць тое, пра што ў старым мы маглі толькі марыць — цір, трэнажорны зал, спартыўная пляцоўка. Таксама каля РУУС з'явілася вялікая гасцявая паркоўка. Дзякуючы гэтаму легкавымі аўтамабілямі наведвальнікаў не будуць абцяжараны размешчаныя побач вуліцы і двары.



Высокія госці прыехалі з падарункамі. Ад міністра ўнутраных спраў РУУС атрымала новы аўтамабіль Geely Atlas, а ад начальніка ГУУС Мінгарвыканкама — Geely Emgrand.

Ігар Шуневіч падчас гутаркі з журналістамі асобна спыніўся на нядаўніх выпадках ілжывага «мініравання» буйных аб'ектаў, у тым ліку гандлёвых цэнтраў.

— Пакуль зламыснікаў затрымаць не ўдалося. Але магу паведаміць, што яны знаходзяцца за мяжой. Мы ўстанавілі, дзе знаходзяцца серверы. У Беларусі такія лжэмінёры заўжды затрымліваліся. Таму прыцягненне да адказнасці замежных «жартаўнікоў» — справа будучыні.

Аднак ужо выпрацаваны механізм рэагавання на такія паведамленні. Асабліва гэта важна ў кантэксце маючых адбыцца ІІ Еўрапейскіх гульняў.

— Тыя аб'екты, якія будуць задзейнічаны на спартыўных спаборніцтвах, мы бяром пад кругласутачную ахову. Мы загадзя правяраем іх з дапамогай сапёрных і піратэхнічных груп, а таксама службовых жывёл і спецыяльнай апаратуры. Таму, калі і з'явяцца нейкія паведамленні, яны не ўнясуць гармідар у арганізацыю мерапрыемстваў. Рэагаваць будзем у любым выпадку.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота БелТА.**



Футбол

# ПАСТАРАЦЦА ДАМАГЧЫСЯ МАКСІМУМУ

## Нацыянальная зборная па футболе рыхтуецца да дамашніх матчаў адборачнага турніру чэмпіянату Еўропы

**У панядзелак каманда сабралася ў Мінску ў поўным складзе. Футбалісты, якія прадстаўляюць замежныя клубы, прыступілі да падрыхтоўкі раней за астатніх і трэніраваліся па індывідуальных планах. На збор былі выкліканы 23 футбалісты. Як адзначыў галоўны трэнер зборнай Ігар Крывушэнка, на дадзены момант гэта найбольш падрыхтаваныя гульцы.**



У суботу, 8 чэрвеня, у матчы трэцяга тура кваліфікацыйнай групы С беларусы сустрэнуцца з камандай Германіі, а 11 чэрвеня згуляюць з футбалістамі Паўночнай Ірландыі. Абодва паядынкі на полі «Барысаў-Арэны» пачнуцца ў 21.45.

«Каб былі шанцы на перамогу, трэба добра вывучыць саперніка, месцы, дзе можаш аказаць ціск, прымусіць памыляцца, — каментуе першы паядынак з немцамі Ігар Крывушэнка. — У той жа час вывучыць, дзе гэта можа зрабіць сапернік і паспрабаваць закрыць тыя зоны і футбалістаў. Цяпер практычна ўсе гульні яны правялі па схеме 3-4-4. Гуляюць у тры цэнтральныя абаронцы. Матч супраць Галандыі паказаў, што гэта збалансаваная каманда, якая мае гульцоў добрага ўзроўню». Галоўны трэнер не стаў дзяліць гульні з Германіяй і Паўночнай Ірландыяй па статусе. «Ёсць гульня з Германіяй — рыхтуемся і пастараемся максімальна ўдала згуляць у гэтым матчы. Наступная гульня супраць Паўночнай Ірландыі — будзем рыхтаваць каманду да наступнага саперніка. Я не сказаў бы, што матч з Германіяй не такі важны, як з Паўночнай Ірландыяй. У нас ёсць дзве гульні, і трэба паспрабаваць дамагчыся максімуму ў абедзвюх», — адзначыў Ігар Крывушэнка.

Нагадаем, на старце адборачнага турніру Еўра-2020 зборная Беларусі пацярпела два гасцявыя паражэнні — ад Нідэрландаў (0:4) і Паўночнай Ірландыі (1:2). Нямецкія футбалісты абыгралі ў гасцях галандцаў (3:2), а паўночнаірландцы дома перамаглі эстонцаў (2:0).

**Турнірнае становішча:** Паўночная Ірландыя — 6 ачкоў (2 матчы), Германія — 3 (1), Нідэрланды — 3 (2), Эстонія — 0 (1), Беларусь — 0 (2). У фінальную стадыю кантынентальнага першынства выйдуць па дзве найлепшыя каманды з 10 адборачных груп, яшчэ чатыры пуцёўкі атрымаюць пераможцы плэй-оф Лігі нацый УЕФА.

Футбалісты, што былі запрошаны на трэніровачны збор:

**варатары —** Аляксандр Гутар («Дынама-Брэст»), Андрэй Клімовіч («Шахцёр», Салігорск);

**абаронцы —** Аляксандр Мартыновіч («Краснадар», Расія), Ігар Шытаў («Дынама-Мінск»), Дзяніс Палякоў («Урал», Екацярынбург, Расія), МаксімВаладзько («Арсенал», Тула, Расія), Алег Вераціла («Дынама-Брэст»), Мікіта Навумаў («Жэтысу», Талдыкарган, Казахстан), Захар Волкаў (БАТЭ, Барысаў), Кірыл Пячэнін («Віцебск»);

**паўабаронцы —** Сяргей Кісляк, Павел Няхайчык (абодва — «Дынама-Брэст»), Станіслаў Драгун, Ігар Стасевіч (абодва — БАТЭ, Барысаў), Юрый Кавалёў, Валерый Грамыка (абодва — «Шахцёр», Салігорск), Іван Маеўскі («Астана», Казахстан), Міхаіл Гардзяйчук («Табол», Кастанай, Казахстан), Мікіта Корзун («Аль-Фатэх», Эль-Хаса, Саудаўская Аравія);

**нападаючыя —** Дзяніс Лапцеў («Дынама-Брэст»), Максім Скавыш (БАТЭ, Барысаў), Яўген Шыкаўка («Ларыса», Грэцыя).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

За кадрам

# «ДЗЕЦІ Ў НАС НЕВЕРАГОДНЫЯ!»



## Чым уражвалі ўдзельнікі адбору на тэлеконкурс «Талент краіны»

У адным з карпусоў Акадэміі музыкі не праціснуцца: на прыступках і ля ўваходу паўтараюць маналогі падлеткі ў яркіх уборах, перад люстэркам наносяць баявую расфарбоўку акцёры-«коцікі», у адным з пакояў дзеці і дарослыя запаўняюць анкеты, у другім — рэпеціруюць, у калідорчыку раскладваюць рэквізіт і дэкарацыі, а перад гардэробам гуляюць у ладкі ўскудлачаныя мімы. «Як іх потым наноў расчасаць?» — разважае ўголас ахоўнік, але малых такія дробязі не турбуюць.

Гэты шматгалосы каляровы струмень — патэнцыйныя ўдзельнікі адбору чацвёртага сезона рэспубліканскага дзіцячага конкурсу «Талент краіны», якія прыйшлі і прыехалі з розных гарадоў, каб паказаць сябе строгай адборачнай камісіі. Бабруйск, Жодзіна, Рэчыца, Орша, Гродна, Лагойск — па канкурсантах можна вывучаць геаграфію Беларусі. Тым больш што цяперашні кастынг, як расказалі яго арганізатары карэспандэнту «Звязды», стаў рэкордным па колькасці ўдзельнікаў. З улікам салістаў і творчых калектываў у ім узялі ўдзел каля 700 дзяцей і падлеткаў ва ўзросце ад 5 да 15 гадоў — юныя вакалісты і танцоры, інструменталісты, акцёры, чытальнікі, акрабаты і гімнасты і іншыя творчыя асобы.

Прызнацца, ідучы на кастынг, я спрачалася сама з сабой, ці многіх натхніць леташні поспех маленькай актрысы Міланы Хатулёвай з Віцебска. І, можна сказаць, сама ў сябе спрэчку выйграла: сёлета сярод кандыдатаў было як ніколі шмат дэкламатараў і дзяцей ва ўзросце 5—6 гадоў. А адной з самых юных удзельніц у намінацыі «Арыгінальны жанр», якая прадставіла цыркавы нумар, — наогул усяго чатыры гады!

«Прывітанне, у вас таксама акрабатыка? Класны нумар! Мы ўдзельнічалі ў першым і трэцім сезоне праекта, цяпер вось таксама вырашылі паспытаць шчасця». — «А мы выступалі ў другім сезоне, з вамі на год размінуліся», — перамаўляюцца паміж сабой педагогі, пакуль дзеці паўтараюць асобныя трукі. Духу канкурэнцыі не адчуваецца, хутчэй прыязнасць і сяброўская падтрымка — хоць, безумоўна, усе перажываюць і нервуюцца, што скажа камісія там, за дзвярыма.

А ў зале за выступленнямі прэтэндэнтаў назірае не толькі прафесійнае журы (арыгінальны жанр, напрыклад, ацэньвалі акцёр Яўген Крыжаноўскі, вядучыя «Таленту краіны-3» Яўген Булка і Надзея Клемянцёнак, паветраная гімнастка Белдзяржцырка Алена Чухноўская, актрыса тэатра імя Максіма Горкага Алена Дуброўская, кіраўнік дырэкцыі спецпраектаў АНТ Алена Лобач). Партрэты вядомых дзеячаў беларускага музычнага мастацтва, здаецца, таксама пільна і з адабрэннем глядзяць на прадстаўленыя нумары.

— Толькі не перажывайце і не крыўдуйце, калі мы вас спынім, — папярэджвае кожнага журы, — бо ўдзельнікаў вельмі шмат, і трэба паслухаць усіх. У любым выпадку выступленні запісваюцца на камеру, і потым мы яшчэ раз іх уважліва пераглядзім, а праз некалькі тыдняў патэлефануем і раскажам пра вынікі, — тым не менш слухаюць ад пачатку да канца амаль усіх, шчодра ўзнагароджваючы апладысментамі асабліва ўдалыя нумары.

А яны, трэба сказаць, былі разнастайныя. Так, дэкламатары і чытальнікі розных узростаў выконвалі ўрыўкі з твораў Антона Чэхава, Яна Лары, Уладзіміра Караткевіча, Ірыны Півараравай, Рыгора Горына. Найцяжэй даводзілася тым, хто выбіраў вершы — па коле гучалі ўсё тыя ж Агнія Барто, Андрэй Усачоў, байкі Кандрата Крапівы і Уладзіміра Корбана... «Хіба для дзяцей нічога новага не пішуць?» — крыху разгублена спытаўся ў калег Яўген Крыжаноўскі. На гэтым фоне «Балада пра каралеўскі бутэрброд» у перакладзе Самуіла Маршака выклікала фурор, тым больш што юная чытальніца пераўвасобілася ў кожнага з персанажаў, ад караля да каровы.



15-гадовая бабруйчанка Ганна Манжурава абрала для чытання ўрывак з «Мёртвых душ» Мікалая Гогаля.

— Гэта з першага тома ці з другога? Вы чыталі наогул другі том? — пажартавалі суддзі. Але жарт не ўдаўся, бо дзяўчына ўпэўнена адказала, што чытала «і другі, і трэці — усё, што ўваходзіць у школьную праграму». Давялося хуценька правесці літаратурны лікбез.

— О, а гэта наш ветэран! — віталі тэлевізійнікі 14-гадовага Валерыя Русецкага. Два гады таму хлопец дайшоў у «Таленце краіны» да паўфіналу і праявіў сябе не толькі як выдатны дэкламатар, але і, магчыма, як будучы драматычны акцёр. Сёлета хлопец яшчэ вышэй узняў планку («Канешне, хочацца перамагчы!»), і паказаны ім гімназіст-донжуан паводле Тэфі быў вельмі арганічны і пераканаўчы.

Трыа «Каты-пажарныя» ўразіла абранай тэмай гераізму і любові да малой радзімы. Наогул, гэты адукацыйны праект, заснаваны на павучальных апавяданнях Уладзіславы Пабрызгаевай (казачныя гісторыі на розныя тэмы расказваюцца дзецям ад імя катоў з пажарнай часці Вугалька, Вулкана, Юпіцера і Метэора), даволі вядомы ў Магілёве — у яго ўваходзяць каля 20 чалавек. Але на кастынг у Мінск прыехалі толькі чацвёра: сама аўтар праекта і яе вучні Ваня Цурпанаў, Ніка Цалабёнак і Маргарыта Лявіцкая.

Кожны з кандыдатаў гатовы паказаць свае найлепшыя здольнасці: 7-гадовая Руслана Вараб'ёва — прачытаць любы з 16 вершаў і апавяданняў, якія яна ведае на памяць, 5-гадовая Юля Захарава — скарыць адразу некалькі хулахупаў, 12-гадовая Соф'я Ткачэнка — не толькі прадэманстраваць талент кампазітара і скрыпачкі, але і выканаць без пяці хвілін оперную партыю, Ліза Пецікава з Ліды можа і на флейце сыграць, і праспяваць, і маналог прачытаць...

«У нас неверагодна таленавітыя, разнапланавыя дзеці! — пацвярджае журналісцкія ўражанні **дырэктар дырэкцыі спецпраектаў АНТ Алена ЛОБАЧ**. — Хоць традыцыйна самая вялікая намінацыя — вакальная, на адбор прыйшло больш за 200 чалавек, але і ў іншых жанрах былі нечаканыя адкрыцці і здзіўленні. Вось уявіце сабе: у ліку інструменталістаў да нас прыйшоў хлопчык, які іграе... на аргане. Ён, магчыма, адзін такі на ўсю краіну! Альбо быў юны музыкант з тубай, большай за самога выканаўцу. Наогул, сёлета хапала рэдкіх інструментаў — на кастынгу гучалі не толькі фартэпіяна і скрыпка, але і гітара, і флейта, і габой, і домра. Некаторыя прыходзілі сем'ямі: браты-баяністы альбо сям'я, у якой і мама, і тата, і дзеці граюць на музычных інструментах, — для тэлебачання гэта проста знаходка. Масу прыемных уражанняў пакінуў і адбор у арыгінальным жанры. Пантаміма, дэкламацыя, цыркавыя выступленні — мы бачылі, як адказна і, не пабаюся гэтага слова, прафесійна падыходзілі дзеці і педагогі да падрыхтоўкі сваіх нумароў. Мяне асабіста вельмі ўсцешыла актыўная прысутнасць рэгіёнаў. Многія ўдзельнікі прыязджалі не толькі з райцэнтраў, але і з аграгарадкоў, невялікіх вёсачак — напэўна, гэта значыць, што праект пайшоў у народ. Гэтыя таленты хочацца абавязкова падтрымаць, працягнуць праект далей, каб паказаць усім, што работа з дзецьмі ідзе не толькі ў сталіцы і абласных цэнтрах, што нават у самай маленькай музычнай школе ёсць выдатныя педагогі і ўнікальныя таленты».

Здымкі «Таленту краіны» пачнуцца ўвосень. Улічваючы, што праект выйдзе ў эфір ужо чацвёрты раз, яго фармат пэўным чынам памяняецца — магчыма, будзе новая сцэна, дэкарацыі або тандэм вядучых. На АНТ кажуць, што якраз цяпер прадумваюць варыянты, як зрабіць конкурс яшчэ больш цікавым і відовішчным, але па-ранейшаму добрым.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК, фота аўтара.**

# ЛЕТА ПАТРЫЁТАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёлета лагеру ваенна-патрыятычнага профілю «Патрыёт» дзесяць гадоў. Дзякуючы віцебскім гвардзейцам тысячы юных гараджан «прайшлі армейскую школу», не скончыўшы яшчэ і звычайную. І многія з іх пасля звязалі свой лёс са службай у арміі, у радах МНС, у ахове парадку.



Падчас кожнай змены, а іх запланавана тры, у летніку адпачне каля 200 дзяцей, у тым ліку і тых, хто знаходзіцца на розных відах прафілактычнага ўліку, а таксама са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў. Усе яны займаюцца ў розных гуртках Віцебскага гарадскога цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Калі падчас доўгіх летніх канікул дзеці застаюцца ў горадзе, на працягу каля трох тыдняў яны могуць адчуць сябе пачаткоўцамі ў арміі.





У летніку дзятва праходзіць імправізаваны курс маладога байца. Ваеннаслужачыя вучаць іх запраўляць ложак, разбіраць і збіраць аўтамат, арганізуюць заняткі ў паветрана-дэсантным комплексе, праводзяць урокі ў камп'ютарным класе. Тут жа вучаць прыцэльвацца і страляць па мішэнях.

Школьнікі наведаюць ваенны музей, дзе будуць паказвацца фільмы ваенна-патрыятычнай тэматыкі. З дзецьмі сустрэнецца і святар царквы, якая знаходзіцца на тэрыторыі брыгады. Кожны дзень з раніцы да дзвюх гадзін дня будзе насычаны мерапрыемствамі.

Змена ў летніку пачалася цырымоніяй падняцця Дзяржаўнага сцяга, што даверылі зрабіць юным віцяблянам. Выступіў ваенны духавы аркестр, разведчыкі паказалі клас падрыхтоўкі: хлопцы разбівалі пліты, не баяліся ляжаць на цвіках, шкле, а адзін з вайскоўцаў падняў парту зубамі.

Школьнікам паказалі казармы, дзе жывуць ваеннаслужачыя, дазволілі выпрабаваць сябе ў ролі днявальных. Дзеці дакрануліся да вайсковых будняў і акунуліся ў жыццё адной з самых элітных армейскіх брыгад на тэрыторыі Еўропы. Тут служаць найлепшыя з найлепшых.



Паводле слоў **намесніка камандзіра па ідэалагічнай рабоце 103-й асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады гвардыі падпалкоўніка Дзяніса КРЫВЯНЦОВА**, падчас работы летніка ўлічваецца ўзрост часовых «байцоў». Заняткі праводзяцца ў забаўляльнай форме, каб дзецям было цікава і яны не стамляліся. Але лагерная змена вельмі карысная, бо навыкі праз некалькі гадоў спатрэбяцца хлопчыкам — будучым салдатам. Ды і дзяўчаты-кантрактніцы сёння не рэдкасць у арміі.

У размове дзеці эмацыянальна дзяліліся ўражаннямі. Некаторыя ў летніку бавяць час ужо не першы год, і гэта ім не надакучыла. Расказвалі хлопчыкі і дзяўчынкі і пра сваякоў, якія служылі і ваявалі ў гады Вялікай Айчыннай і ў Афганістане.

Як паведаміла **начальнік аздараўленчага лагера ваенна-патрыятычнага профілю «Патрыёт» Анжаліка ПАЎЛЕНКА**, супрацоўніцтва з ваеннымі вядзецца пастаянна. І не толькі летам.

У прыватнасці, за апошнія некалькі гадоў у розных мерапрыемствах удзельнічала каля тысячы вучняў і наведвальнікаў гурткоў па інтарэсах. Арганізоўваліся канцэртныя праграмы, спартыўныя спаборніцтвы, творчыя конкурсы, прэзентацыі навукова-практычных работ на ваенную тэматыку, выстаўкі дзіцячай тэхнічнай творчасці... На ўсе мерапрыемствы запрашаюцца прадстаўнікі ваеннага камісарыята, прадстаўнікі ДТСААФ, ветэраны Узброеных сіл.

Усе воінскія фарміраванні стараюцца як мага больш актыўна супрацоўнічаць з установамі адукацыі. У віцебскіх вайскоўцаў гэта атрымліваецца плённа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Міншчына дзівосная

# Ад піянерскай залы да ўнікальнага музея

**Пад дахам Салігорскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі знаходзяцца ўнікальныя музеі — музей Маці і музей піянерскай арганізацыі і сучаснага дзіцячага руху. Такіх устаноў, бадай, няма больш нідзе ў Беларусі.**

У 1985 годзе ў Доме піянераў і школьнікаў Салігорска была заснавана зала піянерскай славы, а ў 1989-м на яе базе стварылі музей. Яго кіраўнік Таццяна Скалабан даўно выйшла з піянерскага ўзросту. Але, нібыта маладая дзяўчына з іскрынкамі ў вачах, гатовая бясконца пра яго расказваць:

— Шматгадовая мэтанакіраваная работа па зборы экспанатаў дазволіла вырасці невялікай зале ў музей з вытрыманай навуковай канцэпцыяй, строгай тэматычнай структурай. У 2010 годзе музею прысвоена званне «народны». У 2016-м ён пацвердзіў гэтае званне. За час майго кіравання ўстановай, з 1986 года, піянерская арганізацыя перажыла развал Савецкага Саюза, перабудову і нарадзілася нанова. 13 верасня 1990 года з'яўляецца днём самавызначэння і стварэння грамадскага аб'яднання «Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя».

У пяці раздзелах экспазіцыі шырока прадстаўлены матэрыялы ўзнікнення, станаўлення і дзейнасці піянерскай арганізацыі, пачынаючы з 1922 года. «Гісторыя піянерскага руху» расказвае пра стварэнне самага першага піянерскага атрада ў Маскве ў 1922 годзе на Краснай Прэсні пры 16-й друкарні. Фарміраванне першых піянерскіх атрадаў у Беларусі пачалося з 20 чэрвеня 1922-га.

— У Палескі край піянерскі рух прыйшоў толькі праз два гады. Першы піянерскі атрад на сучаснай Салігоршчыне з'явіўся ў пасёлку Старобін у 1924 годзе. Гісторыя гарадской піянерскай арганізацыі пачынаецца з пабудаванай у 1959 годзе школы, дзе быў створаны першы піянерскі атрад з чатырнаццаці хлопчыкаў і дзяўчынак. Цяпер у Салігорскім раёне налічваецца 30 піянерскіх дружын і больш за 10 тысяч піянераў, — канстатуе Таццяна Віктараўна.

Людзі старэйшага пакалення, якія наведваюць музей, нібы вяртаюцца ў школьнае шчаслівае дзяцінства, пра якое нагадваюць макеты ўсіх піянерскіх значкоў розных эпох, вымпелы, гальштукі, піянерская і школьная форма, сцягі былой арганізацыі імя Леніна. Цікавяцца яны і сучасным рухам, да якога датычацца іх дзеці і ўнукі: экспазіцыя расказвае пра разнастайныя дзіцячыя аб'яднанні ў незалежнай Беларусі. Вось піянерскія гальштукі і значок, якія насілі дзеці да 2009 года, і новы зялёна-чырвоны гальштук і значок, што былі зацверджаны на XVIII злёце Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі 11—13 снежня 2009-га ў адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня». Цікава, што да гэтага часу дзяцей малодшых класаў называлі «наследнікі». На злёце «наследнікаў» перайменавалі ў акцябрат.

«Арляняты Вялікай Айчыннай вайны» знаёмяць са слаўнымі подзвігамі піянераў Брэсцкай крэпасці, Героя Савецкага Саюза Марата Казея, Зіны Партновай, Валі Коціка, Лёні Голіка і земляка — піянера Алега Вабішчэвіча. Хлопец быў падпольшчыкам, разведчыкам партызанскага атрада. На жаль, яго схапілі і расстралялі фашысты разам з маці.

Усе экспанаты, сабраныя ў гэтым раздзеле, — арыгінальныя. Частка іх прысвечана жыццю і слаўным баявым справам Алены Канстанцінаўны Стэмпкоўскай. Яна нарадзілася ў вёсцы Мазуршчына на Салігоршчыне, была радысткай. Загінула дзяўчына 26 чэрвеня 1942 года, ёй пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Алене Стэмпкоўскай прысвечана кніга «Дзяўчына ў шэрым шынялі». Вельмі каштоўны экспанат — асабістая выніковая картка Алены — арыгінал за 1936—1937 навучальны год. Помняць і ўраджэнца Алтая, лётчыка Георгія Афанасьевіча Кандрацьева, які загінуў у першыя дні вайны ў Салігорскім раёне. Юныя следапыты правялі раскопкі на месцы яго гібелі і знайшлі рэшткі самалёта, якія захоўваюцца ў музеі.

Экспазіцыя «Салігорск малады, ты квітней праз гады» прадстаўляе кнігі, буклеты пра сталіцу шахцёраў, герб горада, фотаздымкі памятных мясцін, а таксама галоўную прадукцыю — калійную і харчовую соль, прадметы шахцёрскай экіпіроўкі.

Экспазіцыя «Нам засталася спадчына» дазваляе ўбачыць першыя школьныя сшыткі, чарніліцу, газніцу, пры якой раней дзеці рабілі ўрокі, навагоднія цацкі, якія адлюстроўваюць асобныя эпохі і навукова-тэхнічны прагрэс. Напрыклад, ёсць цацка, на якой намаляваныя ракета і профіль першага касманаўта Юрыя Гагарына ў скафандры.

Музей стаў візітнай карткай Салігорска, месцам, дзе пазнаецца наша піянерскае мінулае, месцам, дзе збіраюцца шматлікія госці, былыя важатыя, піянерскія актывісты. Тут ва ўрачыстай абстаноўцы прымаюць у піянеры дзяцей, праводзяцца музейныя ўрокі, зборы, круглыя сталы. Работа па пошуку новых экспанатаў не спыняецца. Папаўняецца новымі цікавымі прадметамі і музей Маці.

...Музей Маці — гэта не проста музейная экспазіцыя. Тут сабраны рэальныя факты, успаміны, гісторыі пра лёсы жанчын, якія праславілі Салігоршчыну.

Памятайце, што няўдача можа аказацца ўдачай. Хваляванне часта вядзе да нерацыянальных думак і прымушае непакоіцца ўяўляць найгоршы сцэнарый. І часам такі сцэнарый будзе насамрэч спраўджвацца, і вам давядзецца пераадольваць цяжкасці. У такія моманты вы зразумееце, што вы нашмат мацнейшыя, чым думалі, што рэчы, пра якія вы больш за ўсё непакоіцеся, на самай справе ніколі не бываюць такімі дрэннымі, як вы сабе ўяўлялі. І што вы добра падрыхтаваны, каб спраўляцца з праблемамі.

Пакіньце сваю зону камфорту. Паўторнае ўздзеянне страхаў — найлепшы спосаб іх перамагчы. Падарожжа выдатна для гэтага падыходзіць! Паспрабуйце выйсці са сваёй зоны камфорту і рабіць штосьці новае кожны дзень, напрыклад, высветліць расклад руху грамадскага транспарту ў незнаёмым горадзе ці прыняць запрашэнне паразмаўляць з мясцовымі жыхарамі. Заспакаяльныя практыкаванні дададуць вам упэўненасці: паспрабуйце ўдыхнуць паветра на працягу пяці секундаў і выдыхнуць на працягу сямі.

І не забывайце заахвочваць сябе за намаганні ў барацьбе з панікай.

**Извещение**

Речицкий районный исполнительный комитет отказывается от проведения аукциона по продаже права заключения договоров аренды земельных участков, расположеных по адресам: г. Речица, ул. Молодежная (лот № 20); г. Речица, ул. Светлогорское шоссе (лот № 21); г. Речица, ул. Фрунзе (лот № 22); г. Речица, на пересечении ул. Ленина и ул. Привокзальная (лот № 23), назначенного на 11 июня 2019 г. и опубликованного в номере 86 газеты «Звязда» от 11 мая 2019 года.

УНП 400001745

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**о проведении 24 июня 2019 г. повторного аукциона по продаже изъятого по Указу Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 г. № 87 не завершенного строительством не законсервированного жилого дома и в частную собственность земельного участка, на котором расположен предмет аукциона, в Радваничском сельском Совете Брестского района Брестской области**

| № лота | Местоположение незавершенного строительством не законсервированного жилого дома | Характеристика объекта оценки | Начальная (стартовая) стоимость объекта (бел. руб.) | Сумма задатка, бел. руб. | Возмещение расходов |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Брестский район, д. Малые Радваничи, ул. Цветочная, 9 | Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом в виде капитального строения (фундамента) наружной площадью – 145 кв. м, готовность основного строения 6 %, составные части и принадлежности отсутствуют, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 121283701101000311 площадью 0,1957 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 10 300,00, в том числе: 2298,17 – начальная цена не завершенного строительством жилого дома; 7 769,29 – начальная цена земельного участка; 172,74 – сумма расходов на оценку стоимости незавершенного строительством жилого дома | 1030,00 | 1. Государственная регистрация прекращения права собственности на земельный участок – 76,50 руб.; 2. Объявления – согласно актов выполненных работ |

Имеется возможность электрификации, газификации.

Аукцион будет проводиться 24 июня 2019 г. в 11.00 по адресу: Брестский район, аг. Большие Радваничи, ул. Центральная, 94 (в здании сельисполкома).

Для участия в аукционе необходимо подать заявление и предоставить копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Радваничского сельисполкома (BY61AKBB36410000002621000000, БИК AKBBBY421100 ф-л № 100 ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 200036035, код платежа – 4901) суммы задатка в размере 10 % от начальной цены земельного участка, а также документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Для проведения аукциона необходимо наличие не менее 2 участников. Если аукцион признан несостоявшимся из-за того, что заявление на участие в нем подано только одним гражданином, земельный участок предоставляется этому гражданину при его согласии с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и представлением документации, необходимой для его проведения, осуществляется победителем аукциона либо единственным участником аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: Брестский район, аг. Большие Радваничи, ул. Центральная, 94 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявления 18 июня 2019 г. до 17.00. Дополнительную информацию о земельном участке можно получить по телефонам: 93 11 35, 93 11 36, 93 11 30, 93 16 11

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 18 июня 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 10 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условие продажи: 1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3.** В соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %. Местонахождение лотов №№ 2, 6, 7:** Гомельская обл., г. Чечерск, ул. Советская, 42 | | | | |
| 2 | **Виброкаток двухколесный LTC06**, инв. № 841 | **9 000,00** | 450,00 | 900,00 |
| 6 | **Автомобиль грузовой седельный тягач МАЗ-5440А8 360031**, кузов (рама) № Y3M5440A880001526, 2008 года выпуска, **рег. знак АВ 7249-3,** № инв. 2062 | **23 760,00** | 1 188,00 | 2 376,00 |
| 7 | **Автомобиль грузовой самосвал МАЗ-5551 А2 325**, кузов (рама) № Y3M5551A280001267, 2008 года выпуска, **рег. знак АК 8654-3**, № инв. 801. **Прицеп самосвал МАЗ 8571**, кузов (рама) №Y3M85710080004471, 2008 года выпуска, **рег. знак А 2344 А-3**, № инв. 901 | **25 290,00** | 1 264,50 | 2 529,00 |
| 8 | **Пожарная сигнализация** (инв. № 32). Местонахождение: г. Гомель, ул. Советкая, 74 | **16 470,00** | 823,50 | 1 647,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8 (044 )769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 5 июня 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 17 июня 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене**, увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договора купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 17.04.2019 г. № 72 (28939). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

# ІДЗІ НА ГУКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сутнасць сістэмы ў тым, што калі невідушчы чалавек набліжаецца да аб'екта, які абсталяваны спецыяльным маячком, забяспечаным датчыкамі руху, — за 30—50 метраў да маячка яго смартфон (калі на ім усталяваны названы дадатак) стане вібрыраваць. А потым падаюцца спецыяльныя сігналы, якія могуць папярэджваць пра наяўнасць небяспечнай зоны на шляху — напрыклад, пра яму, бардзюры і г. д. Прычым гук распрацаваны адмысловы, ён не заглушаецца шумам вуліцы. Калі чалавек у будынку, сістэма навігацыі падкажа, дзе знаходзяцца дзверы або лесвіца. Націснуўшы на кнопку «Дадатковае апісанне», можна азнаёміцца з іншымі асаблівасцямі памяшкання — ці ёсць там тамбур, дзе размешчаны туалет і гэтак далей.

Прычым гэта не навігатар — больш правільна было б сказаць, што гэта ўдакладненне да навігатара. Звычайны навігатар таксама дазваляе больш-менш дакладна арыентавацца ў прасторы. Праўда, ёсць адно, але важкае «але»: з яго дапамогай можна апынуцца ў пэўным раёне, але навігатар не падкажа, што вуліца, напрыклад, перакапаная. Асноўны плюс сістэмы «Крокі на гукі» — вельмі дакладная наводка на аб'ект. Дзякуючы гукаваму сігналу невідушчы чалавек не пройдзе міма ганка або дзвярэй, а трапіць туды, куды трэба.

Пакуль што дадатак можа пракласці маршрут ад цэнтральнага праўлення Беларускага таварыства інвалідаў па зроку, якое знаходзіцца на скрыжаванні вуліцы Амуратарскай і Машэрава, — і далей у напрамку да вуліцы Кальварыйскай. Ён ахоплівае такія аб'екты, як Параалімпійскі камітэт, аптэка, пошта, банк, пякарня і гандлёвы цэнтр.

Спецыяльныя гукавыя маячкі ўстаноўлены таксама ў Нацыянальным аэрапорце, у будынку Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Цяпер ажыццяўляецца іх устаноўка на чыгуначным вакзале «Мінск-Пасажырскі» і на іншых сацыяльна значных аб'ектах. Наогул пры пабудове такіх маршрутаў будзе ўлічвацца шмат фактараў. Напрыклад, наколькі часта гэта месца можа наведвацца невідушчымі людзьмі.

**Як працуе сістэма «Крокі на гукі»**

1. Бясплатны мабільны дадатак BuzzPoint спампоўваецца з Play Market або App Store і ўсталёўваецца на мабільны тэлефон. (Уся інфармацыя ў смартфоне невідушчага чалавека агучваецца з дапамогай спецыялізаваных праграм.)

2. За 50 метраў да інфарматара мабільны тэлефон падае сігнал пра тое, што чалавек знаходзіцца ў зоне дзеяння сістэмы. Дадатак BuzzPoint злучаецца з гукавым інфарматарам (маячком) праз Bluetooth.

3. Праграма агучвае спіс даступных кропак, абсталяваных інфарматарамі.

4. У раздзеле «Дадатковая інфармацыя» можна даведацца больш пра аб'ект і навакольны ландшафт, асаблівасці размяшчэння: прыступкі, бардзюры, колькасць дзвярэй і інш.

5. Актывізаваўшы на мабільным тэлефоне неабходны аб'ект, вы пачуеце гук інфарматара і зможаце вызначыць правільнасць кірунку руху.

— Адны з найважнейшых аб'ектаў, якія неабходна пазначаць гукавымі інфарматарамі, — пешаходныя пераходы, асабліва нерэгуляваныя, а таксама прыпынкі грамадскага транспарту, — кажа **дырэктар установы рэабілітацыі інвалідаў па зроку «Цэнтр паспяховага чалавека», намеснік старшыні цэнтральнага праўлення «Беларускага таварыства інвалідаў па зроку» Міхаіл АНТОНЕНКА.** Арганізатары праекта спадзяюцца, што гэтае пытанне ўдасца станоўча вырашыць з ДАІ і Міністэрствам транспарту.

У Віцебску падобны маршрут пракладзены ад унітарнага прадпрыемства «Элект», дзе працуе шмат інвалідаў па зроку, і да ТЦСАН Чыгуначнага раёна, з пазначэннем важных пунктаў маршруту па вуліцы Кірава. Сярод іх дзіцячая паліклініка, аптэка і шэраг крам.

Дарэчы, такія гукавыя маякі таксама могуць інфармаваць наведвальнікаў пра паслугі, якія прадстаўляюцца ўстановай, рэжым яе працы, схему размяшчэння аб'ектаў і гэтак далей. Напрыклад, калі адміністрацыя крамы ўсталюе такі інфарматар на ўваходзе ў краму, ён зможа інфармаваць невідушчых і слабавідушчых пакупнікоў пра акцыі гэтай крамы, схему выкладкі тавараў, прапанаваныя зніжкі.

— Інвалід, які сядзіць дома, не вельмі камфортна сябе адчувае і стварае праблемы для навакольных — і для сваіх блізкіх, і для ўладаў, — кажа Міхаіл Антоненка. — А калі ён уключаны ў актыўную дзейнасць, зарабляе і рэальна ўдзельнічае ў жыцці — ён не адчувае сваёй інваліднасці, і навакольныя таксама яе не заўважаюць. Таму што ён працуе як усе, сам забяспечвае сябе... Але для гэтага дзяржаве трэба ствараць умовы, каб інвалід па зроку мог самастойна паехаць на працу, адправіцца на шпацыр ці па справах, сабраць дакументы, зрабіць пакупкі.

***

Дарэчы, пасля прэс-канферэнцыі, прысвечанай дадзенай тэме, яе ўдзельнікі адправіліся на экскурсію па новым агучаным маршруце. Экскурсаводамі сталі людзі з інваліднасцю па зроку. Журналісты таксама змаглі выпрабаваць новую навігацыйную сістэму і адчуць на сабе, як гэта — перасоўвацца па горадзе, калі нічога не бачыш.

«Мне было рэальна страшна, нічога не было зразумела, я адчуваў небяспеку з усіх бакоў. Нават змакрэў...» — прызнаўся мой калега, які прайшоў па маршруце з завязанымі вачыма. А ён жа рухаўся, можна сказаць, у цяплічных умовах: маршрут быў агучаны, а побач ішлі экскурсаводы і відушчыя людзі, якія маглі зарыентаваць і падказаць...

**Святлана БУСЬКО.**

Фотаімгненні

# Лета. Полацк. Фантан



**Год таму ў старажытным Полацку пасля рэканструкцыі плошчы, на якой узвышаецца фігура нашага першадрукара Францыска Скарыны, адкрыўся інтэрактыўны фантан з сучасным дызайнерскім рашэннем. Цяпер гэтае месца стала сапраўдным цэнтрам горада, тут збіраюцца дзясяткі палачан. У спякотныя дні, як гэта было ўчора, пабыць каля фантана імкнецца моладзь, маладыя бацькі з немаўлятамі, бабулі з унукамі. А Скарына на п'едэстале быццам усміхаецца, пазіраючы зверху на гэтую непасрэдную валтузню людзей між струменяў і пырскаў вады, на смех і радасныя твары: колькі стагоддзяў мінула, а Полацк па-ранейшаму малады і вясёлы.**

**Назіраў, здзіўляўся і здымаў шчаслівых палачан наш фотакарэспандэнт Анатоль КЛЯШЧУК.**









Спытайце пра радзіннае

## Як святкавалі Ушэсце?

**Некалі маці расказвала, што на саракавы дзень пасля Вялікадня выконвалі нейкія перасцярогі ад маланкі. Што гэта за звычай? Можа, былі нейкія яшчэ абавязковыя абрадавыя дзеянні ў гэты дзень? — пытаецца чытачка Святлана Пракаповіч з Буда-Кашалёва.**

У беларускім народным календары чацвер на шостым тыдні ці на саракавы дзень пасля Вялікадня (сёлета гэта акурат заўтрашні дзень) носіць назву Ушэсце, Ушэснік, Шоснік, Узнясенне. З аднаго боку, гэта свята прысвячалася ўзыходу Ісуса на неба, з другога, разумелася літаральна як «рост», «пад'ём», «узыходжанне». З гэтай нагоды ў асяроддзі славян узнікала традыцыя выпякаць у гэты дзень «лесвічку» на дзевяць або дванаццаць прыступак, каб Хрысту лягчэй было на неба ўзыходзіць.

Згодна з народнымі павер'ямі, ад Вялікадня да Ушэсця па зямлі вандруюць Хрыстос і апосталы ў жабрацкім адзенні. Яны выпрабоўваюць чалавечую міласэрнасць, адорваюць добрых людзей і караюць злых. У гэты час трэба даваць як мага больш міласціны, а гаспадыні абавязкова пяклі бліны з тонкага цеста: «Хрысту напекчы анучы».

З гэтым былі звязаны і клопаты пра чысціню зямлі: «Увідзіш трэсачку — падымі, увідзіш бумажку — падымі з дарогі: да Вазнясення Хрыстос па зямлі ходзіць». Лічылася, што той, хто на гэтым тыдні будзе наводзіць парадак вакол хаты, на падворку, вуліцы, будзе «ўзнагароджаны» добрымі адносінамі з дзецьмі, а для жанчын такія дзеянні будуць спрыяць лёгкім родам: «асобенна на Ушэсце нада скідаць з свайго пуці камнікі, штобы роды былі харошымі, і тады, гавораць, харашо, хто да Ушэсця дарожкі прыбірая, тот з глаз парушынкі вынімая... А вабшчэ, да Ушэсця нада ўсягда прыбіраць, штоб дзеці дарогу дамоў зналі» (чытаем у запісах з першакрыніц).

З нядзелі да чацвярга на шостым тыдні пасля Вялікадня жанчынам забаранялася хадзіць з непакрытай галавой, інакш галава будзе балець.

Адной з найбольш цікавых і непаўторных з'яў беларускай культуры можна назваць абрад, які ў народным асяроддзі атрымаў назву «Страла», «Ваджэнне стралы», «Пахаванне стралы», «Сула». Рэгіён бытавання гэтага абраду лакалізаваны ў межах Гомельскай, Бранскай і Чарнігаўскай абласцей, але своеасаблівым эпіцэнтрам найбольш пашыранага існавання абраду з'яўляецца Веткаўскі раён.

Ужо сама назва свята сведчыць пра тое, што асноўнай ідэяй яно было звернута да ўшанавання, уміласціўлення і ўтаймавання адной з наймагутнейшых і непрадказальных сіл прыроды — маланкі, якая пускала на зямлю вогненныя перуновы стрэлы. Яны прыносілі чалавеку шмат бяды: маглі спаліць хату, хлеў, свіран, гумно, палажыць жыта. Год ад году чалавек шукаў розныя шляхі, каб перасцерагчы сябе і сваё жытло ад пракляцця нябёсаў.

Асноўнымі ўдзельнікамі абрадавых падзей былі жанчыны і дзяўчаты. Хлопцы і мужчыны маглі прымаць удзел толькі ў святочных забавах, гульнях, ігрышчах, але яны, як правіла, не дапускаліся да ўдзелу ў ваджэнні карагодаў.

Абрадавая дзея пачыналася адначасова на розных ускрайках вёскі — на пачатку кожнай вуліцы. Гурт жанчын рухаўся ад хаты да хаты, адпаведна колькасць удзельнікаў паступова павялічвалася. Прычым жанчыны ішлі не ў адвольным парадку, натоўпам, а ў адпаведнасці з патрабаваннямі абраду: рукі «пераплятала васьмёркай» (нешта накшталт заплеценай касы або звітай вяроўкі). Такім чынам яны ўтваралі суцэльны адналінейны танок, які нагадваў «стралу»: няйначай як малюнак нябёсаў, прасякнутых зігзагамі маланак, пераносіўся на зямлю, і людзі паўтаралі ўзоры космасу, імітуючы разрады прыроднай стыхіі. Вялікі гурт жанчын рухаўся па вёсцы, каля кожнай хаты прыпыняўся, каб закруціць у кола наступнага ўдзельніка, і хутка запаўняў усю шырыню вуліцы.

Паступова гурты ўдзельнікаў набліжаліся да скрыжавання вуліц (своеасаблівага абрадавага цэнтра вясковай прасторы), на якім пачыналі вадзіць кругавыя карагоды. Сімволіка гэтага абрадавага дзеяння даволі празрыстая і зразумелая: замыкаючы падворкі ў магічнае кола, гурты аднавяскоўцаў актам калектыўнай магіі імкнуліся адвесці прыродную стыхію, ставячы перад ёю непераадольную заслону.

Нарэшце, сабраўшыся разам усёй вёскай, людзі рушылі за яе межы, быццам выводзілі «перуновую стралу» за межы свайго ўладарання, каб «пахаваць» яе на ўскрайку жытнёвага поля. Семантыка гэтага дзеяння і месца яго выканання таксама зразумелыя: перуновую стралу «пахавалі», а вось яе спадарожніка — дождж — прывялі да таго месца, якому вельмі хутка спатрэбіцца нябесная вільгаць.

Можна толькі падзівіцца таму, як нашы далёкія продкі выпрацавалі цэлую сістэму або комплекс сродкаў сімвалічнай перасцярогі сябе, сваёй хаты, гаспадаркі і жытнёвых палеткаў ад Маланкі і Перуна. У аснове той бясконцай колькасці варыянтаў ляжаў адзіны прынцып — асацыятыўнага мыслення, які быў скіраваны на рэалізацыю надзвычай важнай ідэі.

А яшчэ лічылася, што на Ушэсце можна вымаліць любую просьбу, калі знайсці ўдаву, якая пасля смерці мужа дзесяць гадоў жыла адна, ці жанчыну 33-х гадоў і праз яе папрасіць тое, што вам вельмі патрэбна. Толькі трэба, каб знойдзеная вамі «прасіцелька» прыйшла ў вашу хату і каля абразоў шчыра памалілася і прамовіла вашу просьбу.

Гэта быў «знакавы» дзень для прадказання надвор'я на будучыню:

Ушэсце з дажджом, Ілья (2 жніўня) з навальніцай.

Як не будзе дажджу на Ушэсце, дык не будзе шэсць тыдняў.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

***Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».***

Ветраэнергетыка

## ДЗЕ ЗАДЗЬМЕ ВЫГАДНЫ ВЕЦЕР?

На Віцебшчыне плануюць пабудаваць самы магутны ветрапарк у краіне. Інвестара для яго ўзвядзення знойдуць праз біржу

**Сем ветраэнергетычных установак з агульнай устаноўленай магутнасцю 25 МВт і гадавой вытворчасцю электрычнасці 72 ГВт павінны запрацаваць паблізу вёскі Вялешкавічы Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці. Ужо распрацавана ўся неабходная тэхнічная дакументацыя, выбрана аптымальнае месца для размяшчэння ветрапарка і атрыманы дазвол на будоўлю.**

Інвестара для будаўніцтва ветрапарка вызначаць па выніках электронных таргоў, якія пройдуць 11 ліпеня 2019 года на пляцоўцы «БУТБ-Маёмасць». Па выніках перадкваліфікацыйнага адбору камісія на пачатку чэрвеня выбера патэнцыйных інвестараў, якім і прапануюць набыць перадінвестыцыйны актыў — юрыдычную асобу, зарэгістраваную для стварэння і эксплуатацыі ветраэлектрастанцыі. Плануецца, што купляць «зялёную» электраэнергію будзе РУП «Віцебскэнерга».

Таргі пройдуць у рамках завяршальнага этапу праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Скасаванне бар'ераў для развіцця ветраэнергетыкі ў Рэспубліцы Беларусь», які рэалізуецца пры падтрымцы ПРААН, ГЭФ і Мінпрыроды. Усяго ў краіне вызначана пяць пляцовак для размяшчэння ветрапаркаў.

— Ключавая мэта праектаў — прыцягненне прамых інвестыцый у сферу аднаўляльнай энергетыкі, — адзначыла **начальнік упраўлення рэгулявання ўздзеянняў на атмасфернае паветра, змену клімату і экспертызы Мінпрыроды Наталля АЛЕЙНІКАВА.** — Яны таксама прадугледжваюць супрацоўніцтва дзяржавы з прыватным сектарам, што вельмі важна для стымулявання інвестыцыйнай дзейнасці ў Беларусі. Развіццё галіны мае вялікае значэнне і для мінімізацыі выкідаў парніковых газаў у атмасферу і, адпаведна, выканання абавязацельстваў, якія наша краіна ўзяла на сябе згодна з Парыжскім пагадненнем па клімаце.

Па словах **кіраўніка праекта «Скасаванне бар'ераў для развіцця ветраэнергетыкі ў Рэспубліцы Беларусь» Марыны БЕЛАВУС**, сёння лічбы ўстаноўленай магутнасці ветраэнергетычных установак у нашай краіне пакуль не такія вялікія, як, напрыклад, у суседніх Польшчы ці Украіне — каля 100 МВт. Але гэта адкрывае вялікае поле для дзейнасці ў дадзенай сферы.

Каб развіццё сектара аднаўляльнай энергетыкі ішло як мага больш інтэнсіўна, падрыхтаваны праект змен ва Указ Прэзідэнта ад 18.05.2015 г. № 209 «Аб выкарыстанні аднаўляльных крыніц энергіі». Як расказаў **начальнік упраўлення энергаэфектыўнасці, экалогіі і навукі Міністэрства энергетыкі Сяргей ГРЭБЕНЬ**, гэтым дакументам даецца права (у адназначнай трактоўцы. — **Рэд.**) ствараць устаноўкі АКЭ для асабістых патрэб без выдзялення квот. Гэта дазволіць суб'ектам гаспадарання знізіць сабекошт прадукцыі і, магчыма, накіроўваць яе на экспарт.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

Чулі?!

## Зніжаны кошт дазволаў на здабычу зубра

**У краіне скарэкціраваны мінімальны гранічны кошт паляўнічых пуцёвак і прадукцыі палявання.**

Як паведамляе Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал, пастановай Савета Міністраў ад 1 чэрвеня 2019 года № 350 для грамадзян Беларусі зніжаны мінімальны гранічны кошт дазволаў на здабычу зубра (рэзервовы генафонд): сяголетак — да Br800 (раней Br1 тыс.); маладняку ад аднаго да двух гадоў — да Br2,5 тыс. (раней Br3 тыс.).

Таксама ўстаноўлена, што карыстальнікі паляўнічых угоддзяў могуць самастойна вызначаць градацыю вагі рагоў капытных паляўнічых жывёл нармаваных відаў з чэрапам без ніжняй сківіцы для ўстанаўлення памеру платы за дазволы на здабычу для замежных грамадзян. Аднак крайнія мінімальныя значэнні вагі ў градацыі не могуць быць устаноўлены ніжэй за значэнні, указаныя ў пастанове.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Стаць археолагам... за лета

**Летняя археалагічная школа адкрыецца ў БДУ. Гэта першы вопыт у Беларусі, калі авалодаць асновамі раскопак прапануецца ўсім ахвотным, незалежна ад сферы іх прафесійнай дзейнасці. Адзіным абмежаваннем з'яўляецца ўзрост — не маладзей за 18 гадоў.**

Школа пачне работу 2 ліпеня. Перад правядзеннем пошукавых работ дацэнт кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ Вадзім Белявец правядзе інструктаж, а таксама раскажа пра спецыфіку вывучэння артэфактаў.

Арганізуецца школа ў рамках археалагічнай экспедыцыі гістарычнага факультэта БДУ. Група слухачоў сумесна са студэнтамі ўніверсітэта працягне даследаванне паселішча славян III—V стагоддзяў н. э., якое летась адкрылі навукоўцы-гісторыкі БДУ, чым пацвердзілі гіпотэзу паходжання славян з тэрыторый Беларускага Палесся.

На працягу трох тыдняў каля вёскі Яскавічы Салігорскага раёна Мінскай вобласці археолагі-пачаткоўцы правядуць раскопкі з мэтай пошуку ўнікальных гістарычных каштоўнасцяў. Нагадаем, што летась падчас археалагічных работ былі знойдзены прадметы, якія пацвярджаюць заняткі мясцовых жыхароў металургічнай і ювелірнай вытворчасцю. Мяркуецца, што паселішча стала ахвярай ваеннага канфлікту ў сярэдзіне V стагоддзя. На гэты час на месцы раскопак у паселішчы ўжо адкрыты шэраг пабудоў і аб'ектаў, датаваных канцом II — першай паловай V стагоддзя н. э.

Падача заявак ажыццяўляецца па нумары 8 (017) 222-34-09 (кафедра археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ) да 22 чэрвеня ўключна.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

І мы там былі!

## ШОУ «ГОЛАС». АЛЕНІ

**У канцы мая ў заказніку «Чырвоны бор» адбыўся 21-ы чэмпіянат Еўропы вабільшчыкаў аленя. У ім прымалі ўдзел 39 вабільшчыкаў з 13 краін Еўропы: Аўстрыі, Беларусі, Бельгіі, Венгрыі, Германіі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Славакіі, Славеніі, Францыі, Чэхіі і Эстоніі.**

Чэмпіянат праводзіцца кожную вясну спецыяльна, каб не турбаваць аленяў дарма — у згаданы час на імітацыю свайго голасу яны не рэагуюць. Гэта ўвосень, калі надыходзіць перыяд гону, самцоў-рагачоў не цікавіць нічога акрамя самак і боек, і яны равуць на ўвесь голас, заяўляючы аб сваёй пераваге над патэнцыйнымі сапернікамі. Менавіта ў гэты перыяд і адбываецца паляванне на вабу.

Паляванне на вабу (на рову) — адзін з традыцыйных спосабаў здабычы высакароднага аленя ў Еўропе. Вабіць — значыць клікаць звера яго голасам. Удзельнікі чэмпіянату спаборнічалі ў трох дысцыплінах: імітацыя голасу маладога аленя, імітацыя голасу аленя-важака з «гарэмам», імітацыя гукаў аленя-пераможцы пасля сутычкі з сапернікам. Гукі былі гарлавыя, а для ўзмацнення гучнасці вабільшчыкі выкарыстоўвалі самаробныя прылады, якія нагадваюць падзорную трубу (уласна, вабу), і толькі адзін удзельнік выкарыстаў ракавіну.









Аляксандр Казарэз, прадстаўнік беларускай каманды па вабе высакароднага аленя і па сумяшчальніцтве кандыдат сельскагаспадарчых навук, загадчык кафедры турызму, прыродакарыстання і паляўніцтвазнаўства БДТУ, прызнаўся, што гэта не столькі чэмпіянат па вабе (таму што зaverбліваючы звера, паляўнічы выдае некалькі іншыя гукі, дзесьці заціхне, зломіць галінку), колькі па ўменні пераймаць голас аленя, па разуменні біялогіі звера. Бо ўдзельнікаў ацэньвалі суддзі не толькі па правільнай перадачы голасу, але і па настроі, адлюстраванні ўнутранага стану аленя.

Неабходна сказаць, што суддзі, прадстаўнікі розных краін, падчас чэмпіянату знаходзяцца ў закрытых кабінках, не бачаць «выступоўцаў», а толькі слухаюць іх галасы. У гэтым выпадку «сляпое» судзейства — самае справядлівае.

У камандным спаборніцтве першае месца заняла каманда Венгрыі, другое — Славеніі, трэцяе — Славакіі. Адзначым, што вынік нашай краіны, 4-е месца, быў найлепшым для нас за ўвесь час правядзення чэмпіянату. Дарэчы, не хапіла ўсяго трох балаў да п'едэстала гонару: Беларусь атрымала 254 балы, а 257 балаў атрымалі 2-е і 3-е месцы.

У індывідуальным спаборніцтве найлепшым вабільшчыкам Еўропы сталі прадстаўнікі Венгрыі і Францыі.

Адзначым, што Беларусь ужо другі раз становіцца краінай-гаспадыняй чэмпіянату вабільшчыкаў. У 2015 годзе ён праходзіў у Белавежскай пушчы, у ім узялі ўдзел каманды з дзевяці краін. Высокую планку чэмпіянату падтрымаў і прыём «Чырвонага бору». Удзельнікі і госці ацанілі камфортныя ўмовы размяшчэння і выдатную арганізацыю мерапрыемства. Для гледачоў былі прадугледжаны не толькі месцы перад сцэнай, але і фуд-корты, і некалькі вялікіх шатроў на паляне з крэсламі-мяшкамі.

Чэмпіянат праходзіў сумесна з фестывалем «Свята палявання», у праграму мерапрыемстваў якога ўваходзілі не толькі спаборніцтвы, але і катанне на конях, выстаўка паляўнічых сабак, стральба з лука, атракцыёны, майстар-класы па прыгатаванні страў з дзічыны, дэманстрацыя працэсу вытворчасці мёду. Працавала фотавыстаўка і шматлікія фотазоны, выстаўка паляўнічых трафеяў. Для дзяцей працавалі атракцыёны. Мерапрыемствы былі жывыя і відовішчныя.

**Вольга ПРАЛЮК, фота аўтара.**

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі РДГА «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў і Наваполацкае ТАА «Інтэрсэрвіс» (паляўнічая гаспадарка «Чырвоны бор»).

**Центр Промышленной Оценки**
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «Завод автомобильных прицепов и кузовов «МАЗ-Купава», г. Минск, ул. Машиностроителей, д. 18 |

**Предмет аукциона (имущество реализуется одним лотом). Месторасположение: Минская обл., Червенский р-н, Смиловичский с/с, д. Старино**

<u>**Производственная база**</u>: **цех деревообработки с административными помещениями** (615/С-35497, 1027,1 кв. м), в т. ч. вент. камеры – 2 шт., рампа – 2 шт., сети питьев. водопровода – 184,7 м; сети быт. (255,7 м) и ливн. (287,4 м) канализации, очистные сооружения, двухкамер. септик, поля фильтрации 235 м, площадка 6446 кв. м; **склад** (615/С-35853, 150,6 кв. м); **КПП** (615/С-35856, 7,6 кв. м), в т. ч. ограждение 639,7 м; **ТП** (615/С-245, 68,3 кв. м); **водозаборная скважина** (615/С-35855), в т. ч. насос Grundfos;
**насосная станция** (615/С-35496, 25,2 кв. м), в т. ч. 2 резервуара 150 куб. м, сети пожар. водопровода 484,3 м; **иное имущество:** сети электроснабжения и оборудование (в соответствии с перечнем, размещенным на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

**Сведения о земельном участке:** пл. **2,5727 га** предоставлен на праве аренды по 20.11.2115 для обслуживания цеха деревообработки с административно-быт. помещениями, зданий и сооружений. Ограничения – находится в охран. зонах электрич. сетей свыше 1000 В, пл. 0,2 га

**Начальная цена с НДС – 390 386 руб. 07 коп.** (снижена на 50 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** 60 % от цены продажи имущества, с учетом ранее внесенной суммы задатка оплачивается в течение 10 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, оставшаяся сумма оплачивается с рассрочкой платежа на срок до 6 месяцев

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 30.04.2019**

**Аукцион состоится 08.07.2019 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 04.07.2019 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. **www.cpo.by**

---

**Центр Промышленной Оценки**
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29 |

**Предмет аукциона**

| лот № | Наименование | Начальная цена без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Квартира (число комнат – 3)** общей площадью 83,2 кв. м, инвентарный номер 342/D-182936, расположенная по адресу: Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Интернациональная, 46-42 | 57 219,68 |
| 2 | **Квартира (число комнат – 1)** общей площадью 38,8 кв. м, инвентарный номер 342/D-182937, расположенная по адресу: Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Интернациональная, 46-14 | 25 410,88 |
| 3 | **Квартира (число комнат – 3)** общей площадью 72,6 кв. м, инвентарный номер 200/D-138816, расположенная по адресу: г. Витебск, ул. Генерала Ивановского, 24-1 | 91 816,08 |
| 4 | **Квартира (число комнат – 3)** общей площадью 72,8 кв. м, инвентарный номер 200/D-159962, расположенная по адресу: г. Витебск, ул. Генерала Ивановского, 26-1 | 91 816,01 |

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 10 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

В течение **30 (тридцати) календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 09.07.2019 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 05.07.2019 до 17.00 по** указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 413/С-21427 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад запчастей), общей площадью 160,9 кв. м, расположенное по адресу: Свислочский р-н, Порозовский с/с, д. Сокольники, ул. Центральная, 30А/1, склад запчастей; капитальное строение, инв. № 413/С-21428 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – котельная), общей площадью 81,8 кв. м, расположенное по адресу: Свислочский р-н, Порозовский с/с, д. Сокольники, ул. Центральная, 30А/2, котельная; капитальное строение, инв. № 413/С-21432 (назначение – здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции, наименование – обменный пункт), общей площадью 203,2 кв. м, расположенное по адресу: Свислочский р-н, Порозовский с/с, д. Сокольники, ул. Центральная, 30А/3, обменный пункт; капитальное строение, инв. № 413/С-21424 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – мастерские), общей площадью 797,2 кв. м, расположенное по адресу: Свислочский р-н, Порозовский с/с, д. Сокольники, ул. Центральная, 30А/4, мастерские; капитальное строение, инв. № 413/С-21425 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – нефтебаза), общей площадью 44,4 кв. м, расположенное по адресу: Свислочский р-н, Порозовский с/с, д. Сокольники, ул. Центральная, 30А/5, нефтебаза; капитальное строение, инв. № 413/С-21431 (назначение – здание специализированное транспорта, наименование – гараж для комбайнов), общей площадью 727,2 кв. м, расположенное по адресу: Свислочский р-н, Порозовский с/с, д. Сокольники, ул. Центральная, 30А/6, гараж для комбайнов.
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 425285717601000123, площадью 3,2827 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений 1 01 09), расположенном по адресу: Свислочский р-н, Порозовский с/с, д. Сокольники, У-1315. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадью 0,1224 га, код 5,2; земельные участки, расположенные в зонах санитарной охраны водных объектов, используемых для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зонах санитарной охраны в местах водозабора, площадью 0,4936 га, код 2.7

Начальная цена продажи – 130 783 руб. (сто тридцать тысяч семьсот восемьдесят три рубля) с учетом НДС. Сумма задатка – 13 078 руб. (тринадцать тысяч семьдесят восемь рублей)

Продавец – унитарное сельскохозяйственное предприятие «Совхоз «Порозовский», 231982, Свислочский р-н, г. п. Порозово, ул. Я. Колоса, 2, тел./факс 8-01513-203-42

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/сч для перечисления задатка – р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 5 июля 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208,
с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.
Последний день приема заявлений – 1 июля 2019 г. до 15.00**

*Телефон для справок 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
http://grodnoino.by*

---

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 09.07.2019 открытого аукциона

<u>Лот № 1:</u> **капитальное строение с инв. № 700/С-68770 – котельная**, площадь – 687,6 кв. м, назначение: здание специализированное энергетики, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64. Составные части и принадлежности: трехэтажное кирпичное здание котельной с навесом и дымовой трубой. **Капитальное строение с инв. № 700/С-68772 – мазутонасосная**, площадь – 41,0 кв. м, назначение: здание неустановленного назначения, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64. Составные части и принадлежности: Одноэтажное кирпичное здание мазутонасосной. **Капитальное строение с инв. № 700/С-91634 – склад**, площадь – 44,2 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание склада с крыльцом. **Капитальное строение с инв. № 700/С-91635 – склад**, площадь – 256,1 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64. Составные части и принадлежности: одноэтажное металлическое здание склада с двумя заборами. **Емкость металлическая 80 куб. м,** инв. № 1099304; **участок наружной канализации протяженностью 137,1 м** (инвентарный № 700/С-90642), расположенный на земельном участке с кадастровым номером 740100000005004888 (присвоен предварительно) по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского. **Участок наружного водопровода протяженностью 37,2 м** (инвентарный № 700/С-90643), расположенный на земельном участке с кадастровым номером 740100000005004888 (присвоен предварительно) по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского. **Кабель ААБ 3х120 мм² + 1х70 мм²**, год ввода в эксплуатацию – не установлен, вид прокладки – воздушный, протяженностью 40,4 метра, расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского; **кабель ААБ 3х120 мм² + 1х70 мм²**, год ввода в эксплуатацию – не установлен, вид прокладки – воздушный, протяженностью 34,6 метра, расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского; **кабель ААБ 3х95 мм² + 1х50 мм²**, год ввода в эксплуатацию – не установлен, вид прокладки – воздушный, протяженностью 40,4 метра, расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского; **кабель ААБ 3х95 мм² + 1х50 мм²**, год ввода в эксплуатацию – не установлен, вид прокладки – воздушный, протяженностью 34,6 метра, расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского. **Сведения о земельном участке:** <u>капитальные строения, входящие в состав лота, расположены на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005430</u> (площадь – 0,4562 га, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания производственных и складских зданий и сооружений, расположен по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64). На данном земельном участке расположены и иные капитальные строения, не входящие в состав лота. Отдельный земельный участок под объекты продажи не выделен.

***Начальная цена продажи: 247 448,01 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 24 744,80 бел. руб.***

**Дата, время и место проведения аукциона: аукцион состоится 9 июля 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесения задатка: по 08.07.2019 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Продавец:** ОАО «Могилевоблпищепром», УНП 700391109, 212029, г. Могилев, ул. Островского, 64

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, тел. +375 222 72-41-14, Mogilev@ino.by

**Порядок проведения аукциона:** для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лот продается без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч. затраты на организацию и проведение аукциона, в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата за предмет аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты за предмет аукциона

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 29 624-26-25; +375 29 550-09-56, на сайте ino.by**

---

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 01.07.2019 повторного открытого аукциона (цена снижена на 20 %)

